

ГРАМАДЗЯНСКІ КОДЭКС: СПРАВЯДЛІВЫЯ НАВАЦЫІ 3

ШТО РАСКАЖА СВЕЖЫ НУМАР «АЛЕСІ» 6



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

20 КАСТРЫЧНІКА 2023 г. ПЯТНІЦА № 204 (30084)

## КОРАТКА

- У Беларусі сабрана больш за 123 тысяч тон агародніны.
- **Павышаюцца надбаўкі работнікам сферы сацабслугоўвання.**
- Беларуская цэментная кампанія ўдзельнічае ў будаўнічым форуме ў Маскве.
- **Беларуская экспазіцыя будзе прадстаўлена на харчовай выставе ў Абу-Дабі.**
- ВТБ (Беларусь) запусціў анлайн-уклады ў кітайскіх юанях.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Дабрачынныя акцыі «Нашы дзеці» і «Ад усёй душы» пройдуць у перыяд з 15 снежня 2023 года да 15 студзеня 2024 года. Калі акцыя «Нашы дзеці» стала ўжо традыцыйнай, мы яе праводзім ужо больш за 20 гадоў, то акцыя, прысвечаная старэйшаму пакаленню, з'яўляецца навацыяй, ініцыятарам якой выступіў Прэзідэнт нашай краіны. Гэтыя мерапрыемствы дадуць магчымасць яшчэ больш дакладна сфакусіраваць увагу рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання, мясцовых выканаўчых, распарадчых органаў на праблемах асобных катэгорый грамадзян і іх вырашэнні, на аказанні канкрэтнай дапамогі тым, хто сутыкнуўся з цяжкімі жыццёвымі абставінамі. Разлічваем, што традыцыйна ўсе нашы дзяржорганы, грамадскія аб'яднанні, прафсаюзы, актыўныя грамадзяне ўключацца ў працэс віншавання нашых дзяцей з Новым годам і Калядамі, а таксама нададуць увагу пажылым людзям, якія маюць патрэбу ў дапамозе і клопаце».*

ISSN 1990 — 763X

23204>

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «МЕНАВІТА ЦЯПЕР НАСТАЎ САМЫ ПРЫДАТНЫ ЧАС ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ПРАМЫСЛОВАЙ КААПЕРАЦЫІ БЕЛАРУСІ І МАРДОВІІ»

## Якія кірункі самыя перспектыўныя, а ў якіх «поле неаранае»

**Кірункі супрацоўніцтва з расійскімі рэгіёнамі зноў разгледзелі ў Палацы Незалежнасці. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўніком Рэспублікі Мардовія Арцёмам Здунавым.**

Вітаючы гасцей, Прэзідэнт заўважыў, што для Арцёма Здунава гэта не проста рабочы візіт. Гэта яшчэ і прычыненне да гераічнай гісторыі яго сям'і. Арцёма Здунава яднае з Беларуссю подзвіг стрыечнага брата яго дзеда Васіля Здунава. У ліпені 1944 года каля вёскі Сунішча Чэрвеньскага раёна разлік гарматы пад камандаваннем Васіля Здунава арганізаваў абарону і паспяхова адбіў атаку ворага. Васіль Здунаў быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што шчыра вітае ініцыятыву ўсталяваць пабрацімскія сувязі паміж Чэрвеньскім раёнам Мінскай вобласці, дзе ваяваў Васіль Здунаў, і яго радзімай — Ацяшэўскім муніцыпальным раёнам Мардовіі.

«А нашы баталіі сёння працягваюцца ў палях, на заводах, у культурнай, інфармацыйнай сферах, у школах і ўніверсітэтах за нашу праўду, нашы перспектывы развіцця, наша права быць суверэннымі і незалежнымі, — сказаў беларускі лідар. — Усё гэта будзе, калі будзем мець моцную эканоміку. Гэта база ўсяго».

У мінулым годзе Беларусь і Мардовія дасягнулі рэкорднага тавараабароту — пад 90 мільёнаў долараў. А па выніках васьмі месяцаў 2023 года прыкметна перавысілі гэты парог. Тэмп росту — амаль 300 працэнтаў, ці 115 мільёнаў долараў. «Прычым гэта далёка не мяжа, рэсурсаў для далейшага росту больш чым дастаткова», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Традыцыйна Беларусь і Мардовія супрацоўнічаюць у машынабудаванні і металургіі, хіміі і нафтахіміі, электроніцы, АПК. Амаль 15 працэнтаў патрэбы Беларусі ў оптавалакне забяспечвае Мардовія. Беларускія суб'екты гаспадарання ў сваю чаргу экспартуюць шырокую гаму прадукцыі машына- і станкабудавання, дрэваапрацоўкі, хімічнай і лёгкай прамысловасці, сельскагаспадарчую сыравіну і прадукты харчавання.

### Цікавых тэм для супрацоўніцтва шмат

Прэзідэнт звярнуў увагу на адсутнасць двухбаковых вытворча-кааперацыйных праектаў. «Менавіта цяпер настаў самы прыдатны час для развіцця прамысловай кааперацыі, у першую чаргу сумесных імпартазамяшчальных вытворчасцяў, перспектыўных вытворчасцяў.



Фота БелТА.

Тым больш, як мне дакладваюць, Мардовія ўваходзіць у лік лідараў у Расіі па долі інавацыйнай прадукцыі ў аб'ёме прамысловай вытворчасці», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Беларусі цікавы вопыт работы нядаўна створанай у Мардовіі свабоднай эканамічнай зоны. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што такія пляцоўкі ёсць і ў кожнай вобласці Беларусі. «Мы маглі б удзельнічаць у стварэнні сумесных прадпрыемстваў у мікра- і радыёэлектроніцы. Адпаведныя кампетэнцыі ў Беларусі захаваны з часоў СССР і цяпер развіваюцца», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён звярнуў увагу, што беларускім спецыялістам было б цікава азнаёміцца і паўдзельнічаць, калі гэта магчыма, у стварэнні ў Мардовіі Федэральнага біятэхналагічнага цэнтра. «Мы маем досвед работы ў гэтай сферы і плануем разгарнуць у Беларусі на базе Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай кампаніі біятэхналагічны кластар. Ды і з улікам пандэміі ва ўсім свеце тэма лекавай бяспекі набыла асаблівае значэнне, якое будзе толькі ўзрастаць. Гэта адна з інвестыцый у будучыню не толькі нашых краін, але і ўсяго свету», — сказаў Прэзідэнт.

СТАР. 2

Гэта — мы!

# Інтэлектуальная скарбніца маладзёжных ініцыятыў

## У Мінску праходзіць фінал міжнароднага праекта «100 ідэй для СНД»

**Разлічваць, у першую чаргу, на сябе, а не на штучны інтэлект, заклікаў удзельнікаў міжнароднага маладзёжнага праекта «100 ідэй для СНД» міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Андрэй ІВАНЕЦ.**

— Тэхналогіі штучнага інтэлекту ствараюцца менавіта вамі, таму, упэўнены, што яму чалавечы розум не перасягнуць. Толькі чалавек будзе рухаць навуку і грамадства наперад, — падкрэсліў ён.



СТАР. 3

Нагода для радасці

# БАНАНАВАЯ ГАСПАДАРКА

## У знакамітай аграарганізацыі Магілёўскага раёна гэтым летам атрымалі не толькі ўраджай збожжавых, але і экзатычных пладоў

**Навіна пра тое, што ў агракамбінаце «Зара» спеюць бананы, хутка абляцела краіну. Цяпер адкуль толькі сюды не прыязджаюць, каб падзівіцца на незвычайную з'яву. Карэспандэнт «Звязды» таксама адправілася ў славутую гаспадарку высвятляць падрабязнасці.**



СТАР. 4

# «МЕНАВІТА ЦЯПЕР НАСТАЎ САМЫ ПРЫДАТНЫ ЧАС ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ПРАМЫСЛОВАЙ КААПЕРАЦЫІ БЕЛАРУСІ І МАРДОВІІ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

«Вы таксама, напэўна, у курсе, што мы цяпер актыўна працуем з расійскімі партнёрамі над канцэпцыяй стварэння самалёта для рэгіянальных перавозак. Магчыма, з улікам вашага вытворчага патэнцыялу мы маглі б знайсці кропкі судакранання і ў гэтым пытанні», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Таксама, паводле яго слоў, беларускі бок зацікаўлены ў супрацоўніцтве з кампаніяй «Рузхіммаш» па развіцці ліцейнай вытворчасці і выпуску абсталявання для хімічнай прамысловасці. У сваю чаргу беларускія спецыялісты гатовыя падзяліцца вопытам і тэхналогіямі выкарыстання другасных рэсурсаў, у тым ліку сінтэтычнага РДФ-паліва, для атрымання цеплавой энергіі.

Прэзідэнт вітаў ініцыятыву па стварэнні шматфункцыянальнага цэнтра па рэалізацыі і тэхнічным суправаджэнні тэхнікі беларускай вытворчасці. «Мы таксама маглі б пашырыць супрацоўніцтва па пастаўках сельскагаспадарчай прадукцыі і харчавання. Упэўнены, можна знайсці новыя магчымасці для работы ў будаўніцтве і ЖКГ. У гэтых сферах у нас з вамі, на жаль, пакуль неаранае поле», — зазначыў беларускі лідар. Ён перакананы, што надышоў час таксама актыўна развіваць узаемадзеянне і па ўсім спектры гуманітарнага супрацоўніцтва, даць магчымасць камунікаваць моладзі.

«Як вы бачыце, цікавых тэм для супрацоўніцтва шмат — і на найбліжэйшую, і на аддаленую перспектывы. Усё, аб чым дамовімся, будзьце ўпэўненыя, будзе выканана. Таму нам вельмі важна, каб ваш візіт быў напоўнены канкрэтнымі дамоўленасцямі. Мы да гэтага гатовыя», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Тэма прамысловай кааперацыі паміж Беларуссю і Мардовіяй стала цэнтральнай тэмай візіту дэлегацыі рэспублікі ў нашу краіну. Члены дэлегацыі наведалі шэраг буйных беларускіх прадпрыемстваў. Таксама праведзена пасяджэнне Рабочай групы па супрацоўніцтве Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Мардовія Расійскай Федэрацыі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

### «БЕЛАРУСЬ — НАШ КЛЮЧАВЫ ПАРТНЁР. ТУТ РЫЗЫКІ МІНІМАЛЬНЫЯ»

Падчас размовы з журналістамі Арцём Здунаў падкрэсліў, што ў Мардовіі прадметна пераасэнсавалі свае адносіны з Беларуссю і на ўзроўні кіраўнікоў прадпрыемстваў сталі бліжэй камунікаваць з беларускімі калегамі. «У нас вельмі шмат сумесных праектаў. І сёння мы казалі не аб тым, што рост пайшоў, а абмяркоўвалі рэзервы, што яшчэ мы не зрабілі. У прыватнасці, я звярнуўся да Аляксандра Рыгоравіча і да ўрада з тым, што мы, як адзіныя вытворцы оптавалакна на прасторы ЕАЭС, прапануем, каб у Беларусі ў шырокім маштабе выкарыстоўвалася оптавалакно. Гэта цалкам магчыма, і гэта пытанне агульнай эканамічнай бяспекі Саюзнай дзяржавы, таму што гэта стратэгічны рэсурс. Другое пытанне і таксама рэзерв для росту — супрацоўніцтва ў галіне фармацэўтыкі. Мы адны з найбуйнейшых вытворцаў субстанцый для антыбіётыкаў. Гэта біятэхналагічны кірунак, а не проста вытворчасць лекаў, гэта сур'ёзныя навуковыя даследаванні. Аналагічны цэнтр фарміруецца ў Беларусі. Чаму б не працаваць разам над пашырэннем рынку? Наступны кірунак — гэта кааперацыйныя сувязі. У нас праектаў шмат, але яны партнёрскія. У нас каля 60 прадпрыемстваў працуе з Рэспублікай Беларусь. А кааперацыйных сувязяў мала, то-бок сумесных праектаў, калі мы разам заваёўваем рынак. А ў свой час мы рабілі зборачную вытворчасць разам з Мінскім аўтазаводам, прадукцыю якога потым прадавалі і атрымлівалі эканамічную выгаду. Мы хочам гэта вярнуць», — расказаў Арцём Здунаў. Таксама кіраўнік Мардовіі расказаў, што на сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам абмяркоўвалася пытанне з'яўлення сумеснага рэйса. Па яго словах, сёння гэта рэальна, бо аэрапорт Саранска хутка стане міжнародным і адзін з першых рэйсаў павінен паляцець у Беларусь.

«Беларусь — дакладна наш ключавы партнёр. Мы разумеем, што тут рызыкі мінімальныя пры любых сітуацыях», — сказаў Арцём Здунаў.

# «У Беларусі ёсць усе тэхналогіі, каб узняць Экватарыяльную Гвінею на больш высокі ўзровень»

## Супрацоўніцтва набірае абароты

**Беларусь адкрыта для супрацоўніцтва з партнёрамі блізкімі і далёкімі. Таму ў графіку Прэзідэнта на чацвер была ўключана і сустрэча з міністрам замежных спраў, міжнароднага супрацоўніцтва і дыяспары Экватарыяльнай Гвінеі Сімяонам Аёна Эсона Ангуэ. Гэты візіт — працяг дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты падчас візіту Прэзідэнта Экватарыяльнай Гвінеі Тэадора Абіянга Нгема Мбасага ў Беларусь у верасні.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларускі бок апошнім часам цесна супрацоўнічае з Экватарыяльнай Гвінеяй, каб выпрацаваць канкрэтны план узаемаадносін дзвюх краін. Прэзідэнт таксама анансаваў свой візіт у Экватарыяльную Гвінею, які ўжо запланаваны.

«Самае галоўнае, каб мы мелі дакладнае ўяўленне, як выбудаваць эканоміку, гандлёва-эканамічныя адносіны паміж нашымі краінамі. Я ўжо гаварыў Прэзідэнту Экватарыяльнай Гвінеі і вам хачу падкрэсліць, што ў Беларусі ёсць усе тэхналогіі, каб узняць вашу краіну на больш высокі ўзровень. Вы ў гэтым вельмі зацікаўлены, мы таксама. Сутнасць нашых прапаноў заключаецца ў тым, што мы гатовы не толькі прадаваць вам прадукцыю, у якой вы маеце патрэбу. Мы гатовы не толькі перадаваць вам тэхналогіі, мы гатовы навучыць вашых людзей працаваць ва ўмовах гэтых тэхналогій. І добра было б, гэта другі напрамак, калі б у нас з вамі атрымалася стварыць такую вытворчую базу ў Экватарыяльнай Гвінеі, якая магла б працаваць хаця б на суседнія дзяржавы», — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка разлічвае, што гэты візіт міністра замежных спраў, міжнароднага супрацоўніцтва і дыяспары Экватарыяльнай Гвінеі стане галоўным этапам у падрыхтоўцы будучай сустрэчы двух лідараў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

Журналістам Сімяон Аёна Эсона Ангуэ расказаў, што ў пасланні ад Прэзідэнта Экватарыяльнай Гвінеі, якое ён перадаў беларускаму лідару падчас сустрэчы, змяшчаюцца словы аб умацаванні адносін дзвюх краін. Таксама ў гэтым пасланні Прэзідэнт Экватарыяльнай Гвінеі запрашае Прэзідэнта Беларусі наведаць яго краіну з афіцыйным візітам.

«Мы абмяркавалі ўзаемавыгадныя праекты ў сферы прамысловасці, аховы здароўя, сельскай гаспадаркі і харчавання, падрыхтоўкі кадраў і іншых кірунках. Як мы ўсе ведаем, Беларусь валодае перадавымі тэхналогіямі, якімі мы не валодаем у Экватарыяльнай Гвінеі. Супрацоўніцтва з беларускім бокам дазволіць дыверсіфікаваць эканамічнае развіццё Экватарыяльнай Гвінеі», — адзначыў міністр.

Гэтым разам у Беларусь з Экватарыяльнай Гвінеі прыехала вялікая дэлегацыя, у склад якой увайшлі міністры сельскай гаспадаркі, жывёлагадоўлі і зямельнага развіцця, аховы здароўя і сацыяльнага забеспячэння, лясоў і навакольнага асяроддзя, сацыяльнага і жыллёвага будаўніцтва і гарадскога планавання, намеснікі міністраў гандлю, прамысловасці і развіцця бізнесу, культуры, турызму і развіцця рамёстваў, фінансаў і бюджэту. Паралельна з першым пасяджэннем сумеснай пастаяннай камісіі па гандлёвым і эканамічным супрацоўніцтве адбылося завяршэнне міждзяржаўнай працэдуры па ўступленні ў сілу рамачнага пагаднення аб супрацоўніцтве. Пералік прыярытэтных кірункаў досыць шырокі: ад машынабудавання і інфармацыйных тэхналогій да сацыяльнай сферы. Вялікая ўвага ўдзяляецца сельскагаспадарчай галіне і харчовай бяспецы. Акрамя таго, намечаны планы па пашырэнні дагаворна-прававой базы і падпісанні новых двухбаковых пагадненняў.

## Прыклад для пераймання

# «Калі мы адзіныя, мы можам зрабіць усё»

### У Мінску абмеркавалі перадавыя практыкі, а таксама праблемныя моманты ў навучанні і выхаванні дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця

**З удзелам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ на базе Мінскага дзяржаўнага каледжа лічбавых тэхналогій адбылося выязное пасяджэнне Мінгарвыканкама па пытанні «Аб стварэнні ўмоў для навучання і выхавання дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця».**

Аднак перш удзельнікі пасяджэння азнаёміліся з практыкай навучання прафесіям навучэнцаў, якія маюць асаблівасці псіхафізічнага развіцця. «У мяне не проста пазітыўныя ўражанні ад таго, што я ўбачыла, чым займаюцца ў гэтым каледжы, якая праводзіцца прафесійная падрыхтоўка нашых дзяцей з асаблівасцямі развіцця, — уражанні цудоўныя, — падзялілася спікер верхняй палаты парламента. — Хацелася б падзякаваць кіраўніцтву каледжа, кіраўніцтву горада за тую работу, якую яны праводзяць. У горадзе шэсць каледжаў, якія прымаюць на навучанне хлопцаў і дзяўчат з асаблівасцямі развіцця. Нізкі паклон педагогам, якія працуюць у гэтых установах».

Наталля Качанава нагадала, што ў Савеце Рэспублікі створаны Кансультатыўны савет па пытаннях сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. «Савет разглядае пытанні інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі развіцця ў грамадстве, — паведаміла яна. — Мы ўжо разгледзелі, як працуе сістэма аховы здароўя ў гэтай галіне, сістэма адукацыі, школа, як працуе сістэма сацыяльнай абароны. А сёння мы бачым прафесійнае навучанне гэтых маладых людзей. У далейшым гэта — магчымасць працаваць, жыць нармальным жыццём у соцыуме, магчымасць рабіць усё не толькі для сябе, але і на карысць нашай краіны».

Па меркаванні спікера, гэты вопыт, які сёння дэманструе Мінск, павінен быць запатрабаваны. «Мы павінны мець такія каледжы ў кожнай вобласці нашай краіны, тым больш што такая задача была пастаўлена раней, — дапоўніла Наталля Качанава. — Гэта добры прыклад, трэба гэтым займацца. Гэта тое, пра што мы заўсёды кажам: міласэрнасць, падтрымка адзін аднаго. Гэта тое, што робіць нас людзьмі. Калі мы адзіныя, калі мы разам, мы можам зрабіць усё для таго, каб аказаць дапамогу і падтрымку кожнаму, хто ў ёй мае патрэбу. І разам з тым атрымліваць сур'ёзную аддачу — як для дзяржавы, так і людзей, якія займаюцца гэтай работай».

У каледжы рэалізаваны прынцып «роўны навучае роўнага». Як адзначыў **дырэктар Мінскага дзяржаўнага каледжа лічбавых тэхналогій Георгій КОЗЕЛ,** сёлета тут упершыню выпусцілі групу татальна невідушчых праграмістаў. «Сёння дзеці атрымліваюць інтэлектуальныя прафесіі — гэта хлопцы і дзяўчаты з парушэннем апорна-рухальнага апарату, парушэннем слыху і татальна глухія, татальна невідушчыя і з расстройствам аўтыстычнага спектра», — расказаў ён.

Прычым у каледжы навучаюць не толькі пэўнай прафесіі, але і прыстасоўвацца да гэтага свету. «Я рада, што жыву ў такой краіне, дзе магу працаваць і навучацца на роўных з іншымі людзьмі, — падкрэслівае невідушчы **педагог Мінскага дзяржаўнага каледжа лічбавых тэхналогій Анастасія БЯРГОВІНА.** — У каледжы я кірую клубам інклюзіўнай творчасці, у якім займаюцца рабяты з парушэннямі зроку, слыху. Важна, што мы заўсёды разам, незалежна ад нашых асаблівасцяў. Ганаруся, што працую ў такім унікальным каледжы, дзе створаны ўсе ўмовы для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Самае галоўнае — тут кожны куток напоўнены цёплай атмасферай, дзе кожны можа раскрыць свой творчы патэнцыял і адчуць сябе значнай часткай грамадства».

Удзельнікі пасяджэння азнаёміліся з карцінамі невідушчага педагога. Экспазіцыя яе работ таксама выстаўлена ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Прыярытэтная ўвага да падтрымкі сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва, у тым ліку людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, з'яўляецца неад'емнай часткай дзяржаўнай палітыкі. У нашай краіне выбудавана эфектыўная сістэма сацыяльнай падтрымкі, дапамогі і рэабілітацыі, шмат зроблена для ўмацавання здароўя, навучання і адаптацыі такой катэгорыі грамадзян.

Як адзначыў **старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ,** у навучанні і выхаванні дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця важная сістэмная работа, што відаць на прыкладзе выкладчыкаў і выпускнікоў каледжа. «Гэта людзі, якія знайшлі сябе, — канкрэтызаваў ён. — Дзякуючы свайму цвёрдаму жаданню быць разам з грамадствам яны даказалі, што можна атрымаць вышэйшую адукацыю, прычым не адну, а дзве і тры. Мы павінны вызначыць напрамкі, па якіх у найбліжэйшы час пашырыць пералік і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, і ВНУ, дзе змогуць вучыцца дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця».

**Паводле БелТА.**

Навацыі

# Па прынцыпе справядлівасці

## Якія змяненні прадугледжвае Грамадзянскі кодэкс



**11 кастрычніка ў другім чытанні дэпутаты Палаты прадстаўнікоў прынялі праект Закона «Аб змяненні кодэксаў», які прадугледжвае комплексную карэкціроўку Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Замацоўваюцца новыя інстытуты грамадзянскага права, уніфікуецца заканадаўства нашай краіны з грамадзянскім заканадаўствам дзяржаў — членаў ЕАЭС, удасканальваюцца нормы кодэкса з улікам практыкі яго прымянення. Акрамя таго, змяненні закрануць Банкаўскі, Працоўны і Жыллёвы кодэксы.**

Усе навацыі накіраваны на справядлівасць у вырашэнні пытанняў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання, стымуляванне законапаслухмяных і добрасумленных адносін усіх удзельнікаў праваадносін да сваіх правоў і абавязкаў. Аб некаторых новаўвядзеннях падчас прэс-канферэнцыі расказала **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ.**

### Гарантыя добрасумленным кіроўцам

Канцэптуальна мяняецца падыход да адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў. Нормы Грамадзянскага кодэкса, якія рэгламентуюць гэтае пытанне на бягучы момант, прадугледжваюць адказнасць «без віны» і не дазваляюць улічыць законапаслухмяныя паводзіны кіроўцаў. Здараюцца выпадкі, калі падчас дарожна-транспартнага здарэння кіроўца транспартнага сродку не парушае Правілы дарожнага руху, але не па яго віне, а па грубай неасцярожнасці пацярпелага, адбываецца ДТЗ, у выніку якога наносіцца шкода здароўю і жыццю, напрыклад пешахода.

«У гэтым выпадку закон не дапускай адмовы ад пакрыцця такой шкоды, у тым ліку маральнай, — адзначыла Святлана Любецкая. — Сёння з улікам шырокага грамадскага абмеркавання, у тым ліку з удзелам практыкаў, навуковай супольнасці, закон прадугледжвае магчымасць адмовы пакрыцця шкоды, нанесенай жыццю і здароўю ў выпадку, калі яна наступіла ў выніку грубай неасцярожнасці пацярпелага і адсутнасці віны прычыніцеля шкоды. Пры гэтым абставіны павінны сведчыць аб тым, што дзеянні кіроўцы не былі звязаны з парушэннем правілаў эксплуатацыі транспартнага сродку, Правілаў дарожнага руху».

Раней такія сітуацыі выклікалі судовыя спрэчкі. У кіроўцаў транспартнага сродку ўзнікала непаразуменне, чаму яны павінны пакрываць нанесеную ў выніку ДТЗ шкоду ў выпадку ўласнай невінаватасці ў аварыі.

### Засцерагчы дзяцей

З мэтай папярэджання правапарушэнняў, а таксама злачынстваў з удзелам падлеткаў выключаецца магчымасць адкрыцця непаўналетнімі ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў разліковых бягучых рахункаў без згоды іх законных прадстаўнікоў (бацькоў, усынавіцеляў, папячыцеляў).

«Без згоды бацькоў такія асобы могуць адкрываць у банку разліковыя бягучыя рахункі толькі з базавымі ўмовамі абслугоўвання: для атрымання стыпендыі, заработнай платы, — патлумачыла дэпутат. — Ва ўсіх астатніх выпадках для таго, каб дзіця атрымала плацёжную банкаўскую картку, патрэбна будзе згода аднаго з бацькоў. Гэта пацягне памяншэнне злачынстваў у галіне незаконнага абароту псіхатропных і наркатычных сродкаў. Бацькі павінны ведаць, якімі грашовымі сродкамі карыстаецца іх дзіця, для чаго яму неабходна банкаўская картка і куды ідуць пералічэнні».

Для адкрыцця разліковых бягучых рахункаў у банку непаўналетнімі дастаткова будзе згоды аднаго з законных прадстаўнікоў.

### Або няўстойка, або працэнты

Прадугледжана выключэнне так званай двайной адказнасці суб'ектаў гаспадарання за невыкананне грашовых абавязацельстваў. Згодна з дзеючым заканадаўствам, пры невыкананні грашовых абавязацельстваў наступала адказнасць, у тым ліку ў выглядзе няўстойкі і працэнтаў.

Па словах парламентарыя, часам узнікалі такія сітуацыі, калі няўстойка, а тым больш працэнты, у сувязі з працягласцю перыяду шматразова прывышалі суму абавязацельства. «Фактычна такая адказнасць насіла характар кабальнай, — звярнула ўвагу Святлана Любецкая. — Сёння змянены падыход да двайной адказнасці, і працэнты ў выпадку, калі прадугледжана няўстойка, не падлягаюць спагнанню».

### Адказнасць — для ўсіх

Для выключэння злоўжыванняў у плане адказнасці за невыкананне абавязацельстваў уносяцца змяненні, якія датычацца рэарганізацыі юрыдычных асоб. З улікам выпадкаў сыходу юрыдычных асоб ад адказнасці за кошт рэарганізацыі, якія назіраюцца апошнім часам, замацоўваецца шэраг гарантый правоў крэдытораў пры рэарганізацыі юрыдычных асоб.

«У адпаведнасці з унесенымі змяненнямі, у выпадку рэарганізацыі юрыдычнай асобы адказнасць за невыкананне абавязацельстваў будуць несці як асоба, якая рэарганізуецца, так і тыя суб'екты, якія будуць створаны ў выніку такой рэарганізацыі, а таксама ўласнікі, кіраўнікі, упаўнаважаныя на дачу ўказанняў па рэарганізацыі, — канстатавала Святлана Любецкая. — У выпадку, калі рэарганізаваная асоба застаецца без сродкаў, а рэарганізуемая асоба таксама не мае магчымасць выканаць абавязацельства, будзе наступаць субсідыярная адказнасць усіх вышэй указаных асоб».

У грамадзянскі абарот уводзяцца новыя інстытуты. У прыватнасці, канвертуемая пазыка, накіраваная на стымуляванне дзейнасці па развіцці стартапаў. Змяненні датычацца і безадзыўнай даверанасці, запэўнення ў абставінах, калі бакі гарантуюць дакладнасць усіх звестак у адносінах свайго фінансавага становішча, абавязацельстваў, сапраўднасці ўпаўнаважаных асоб на выкананне тых ці іншых дзеянняў.

Змяненні закрануць і шэраг іншых момантаў жыццядзейнасці грамадства. Як расказала Святлана Любецкая, у ходзе работы над законапраектам працоўнай групай было разгледжана звыш 350 заўваг і прапаноў. Многія з іх знойдуць адлюстраванне ў абноўленым Грамадзянскім і іншых кодэксах.

Палажэнні Закона «Аб змяненні кодэксаў» уступяць у сілу праз год пасля яго афіцыйнага апублікавання. Гэтага часу дастаткова, каб грамадзяне, юрыдычныя асобы, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі і іншыя ўдзельнікі грамадзянскага абароту змаглі дэталёва вывучыць змяненні, якія ўносяцца, а таксама прыняць меры, звязаныя з іх рэалізацыяй пасля ўступлення закона ў сілу.

**Вераніка КАНЮТА.**

# Інтэлектуальная скарбніца маладзёжных ініцыятыў

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Сёння тэхналогіі штучнага інтэлекту знаходзяць паўсюднае прымяненне, пачынаючы ад падтрымкі людзей, якія маюць абмежаванні мабільнасці, парушэнні зроку, слыху, да прамысловасці і сельскай гаспадаркі, дзе адбываецца скарачэнне колькасці людзей, задзейнічаных у аграпрамысловым комплексе і на вытворчасці. Рабатызацыя, аўтаматызацыя робяць сваю справу. На дапамогу чалавеку прыходзяць беспілотныя лятальныя апараты. І нашы маладыя людзі вельмі актыўна ўцягваюцца ў навуковыя распрацоўкі ў гэтых сферах.

Учора на базе Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка ўрачыста адкрыўся фінал міжнароднага праекта «100 ідэй для СНД».

Беларусь на міжнароднай арэне прадстаўляюць 12 пераможцаў рэспубліканскага маладзёжнага праекта «100 ідэй для Беларусі» адзінаццатага і дванаццатага сезонаў. Сярод іх — такія праекты, як «Сэнсарная пальчатка для алічбавання жэстаў людзей з абмежаванымі магчымасцямі», «Атрыманне высокаактыўнага мезапорыстага вугалю з адходаў дрэваапрацоўчай вытворчасці», праекты «HoReCa 3D-food printing», «Yacard» — бескантактная smart-візітка, «Беларускі тэтрапак», «Сэнсарныя акуляры для людзей са слабым зрокам», «Клопат пра жывёлін з пратэзамі як новы спосаб рэабілітацыі дзяцей з інваліднасцю» і іншыя.

Трэба заўважыць, што Рэспубліканскі праект «100 ідэй для Беларусі» стаў візітнай карткай Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і брэндам маладой незалежнай Беларусі. Ён стартаваў 12 гадоў таму. А затым яго падхапілі і іншыя краіны — удзельніцы СНД.




— Гэта праект, які дае пуцёўку ў жыццё кожнай маладзёжнай распрацоўцы. Усе навуковыя ідэі маладых людзей павінны быць не проста рэалізаванымі ў лабараторных умовах — яны павінны дайсці да рэальнага сектара эканомікі, да канкрэтнага спажыўца. Менавіта на гэта нацэльвае нас дзяржава, — падкрэсліў Андрэй Іванец. — Важна сказаць, што многія хлопцы і дзяўчаты, якія сталі пераможцамі нацыянальнага адборачнага этапу і сёння прадстаўляюць тут свае праекты, — учарашнія школьнікі. Хтосьці з іх з'яўляецца выпускніком Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка. Сёння яны ўжо сталі студэнтамі вядучых беларускіх універсітэтаў і працягваюць працаваць над сваімі ідэямі пад кіраўніцтвам сур'ёзных вучоных (акадэмікаў і прафесараў).

У міжнародным фінале прадстаўлена 40 праектаў. Міністр адукацыі адзначыў іх высокі ўзровень і падзякаваў Выканкаму СНД за ўвагу, якая ўдзяляецца маладым навукоўцам на прасторы краін Садружнасці.

— Мы бачым тут удзельнікаў з васьмі краін: вялікія прадстаўнічыя дэлегацыі прыбылі ў Мінск з Азербайджана, Расіі, Узбекістана, Таджыкістана... Гэта сведчыць аб тым, што мы выбудоўваем адзіную навукова-тэхналагічную прастору, праводзім адзіную маладзёжную палітыку і нашы прыярытэты сыходзяцца ў адным — інтэлект мы павінны выкарыстоўваць для таго, каб нашы краіны былі эканамічна перадавымі, а людзі адчувалі сябе абсалютна камфортна...

**Дырэктар дэпартамента гуманітарнага супрацоўніцтва, агульнапалітычных і сацыяльных праблем Выканкама СНД Аляксей САЗОНАЎ** зачытаў прывітальны адрас генеральнага сакратара СНД Сяргея Лебедзева да ўдзельнікаў фіналу: «Уцягванне маладога пакалення грамадзян у інтэграцыйныя працэсы ва ўсіх сферах дзяржаўных адносін — адзін з прыярытэтаў, вызначаных кіраўнікамі нашых краін у канцэпцыі далейшага развіцця Садружнасці Незалежных Дзяржаў. У гэтай сувязі радуе, што праект «100 ідэй для СНД», асноўнай мэтай якога з'яўляецца аб'яднанне моладзі і актывізацыя яе інавацыйнай дзейнасці для вырашэння задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Садружнасці, з кожным годам становіцца ўсё больш вядомым і запатрабаваным. Рэспубліка Беларусь ініцыявала гэты праект у 2015 годзе пры падтрымцы Савета па справах моладзі дзяржаў — удзельніц СНД і стала першапраходцам у яго арганізацыі ў пілотным рэжыме.

Сёння Беларусь зноў прымае маладых людзей, якія падзяляюць агульныя інтарэсы ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця супрацоўніцтва краін Садружнасці і валодаюць высокім узроўнем крэатыўнага мыслення. Упэўнены, што ўдзел у мерапрыемствах праекта запомніцца яркімі ўражаннямі аб Мінску, яго навукова-тэхналагічнай структуры, а таксама змястоўнымі дыскусіямі і дапаможа ў пошуку аднадумцаў для рэалізацыі сваіх ідэй».

Цяперашні фінал — ужо пяты па ліку. На міжнародным узроўні конкурс праводзіцца раз на два гады. Сярэдні ўзрост фіналістаў — ад 17 да 30 гадоў. Побач прэзентуюць свае ідэі як школьнікі, так і маладыя паспяховыя бізнесмены. Сярод намінацый гэтага года — «IT-сфера», «Бяспека», «Медыцына і ахова здароўя», «Вытворчыя тэхналогіі і прамысловая інфраструктура», «Рацыянальнае прыродакарыстанне», «Сацыяльная сфера», «Адукацыя», «Гасціннасць, турызм і нацыянальная культура».

— Сёння мы бачым тут прафесійны падыход і, галоўнае, прафесійны вынік, — падзяліўся ўражаннямі ад убачаных на выставе праектаў Аляксей Сазонаў. — Лічу, што задача — абудзіць у маладых людзях інтарэс да даследчай дзейнасці, да пошукавай работы — дасягнутая. Шчыра кажучы, я не зайздрошчу членам журы, якім давядзецца вызначаць пераможцаў. Мы разумеем, што конкурсны фактар заўсёды прысутнічае ў нашым жыцці, ён яшчэ больш актывізуе нас і матывуе да пошуку рашэнняў. Але галоўнае на гэтай пляцоўцы — усё ж не перамога, а знаёмствы, сяброўствы, магчымасць заявіць аб сабе на самую шырокую аўдыторыю і быць пачутымі.

У рамках фіналу для гасцей беларускай сталіцы падрыхтавана экскурсійная праграма. Яны ўжо наведалі Палац Незалежнасці. Савет маладых вучоных пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь арганізаваў для гасцей інтэлектуальную гульню «Аднойчы ў СНД». Пасля ўрачыстай цырымоніі адкрыцця фіналу адбыўся адкрыты дыялог з міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь Андрэем Іванцом.

Маладых наватараў таксама чакаюць майстар-класы па прамоўніцкім майстэрстве і развіцці асабістага брэнда, прэзентацыя Цэнтра садзейнічання маладым спецыялістам — базавай арганізацыі па развіцці маладзёжнага прадпрымальніцтва ў СНД.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# БАНАНАВАЯ ГАСПАДАРКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Унук па справах паехаў у Гродна, а яму гавораць: гэта ж трэба — у Магілёве бананы вырасцілі! Ён жартам ім у адказ: дык гэта мая бабуля паклапацілася, — усміхаецца загадчыца па гаспадарцы Галіна Макар і дадае: — Мы тут самі не чакалі такога сюрпрызу.

Бананавыя расліны ў адміністрацыйным будынку аграгаспадаркі «Зара» растуць ужо 16 гадоў, але плады на іх з'явіліся ўпершыню. Былы легендарны кіраўнік «Зары» Леанід Майсееў спецыяльна стварaў умовы для экзатычнага саду. З яго лёгкай рукі адміністрацыйны будынак упрыгожыўся своеасаблівым фае-аранжарэяй. Першае, што трапляе на вочы, калі заходзіш у яго, — шырокая лесвіца на другі паверх, за якой і адкрываецца від на зялёны аазіс з трапічнымі раслінамі. На 20 квадратных метрах буяюць манстэра, фікус, малачай белажыльчаты, дыфенбахія, традэсканцыя, спацыфілумы, падобны на папаратнік адзіянтум, які яшчэ называюць Венерын волас. Але салірують, канешне, бананы з іх раскідзістым шырокім лісцем.



Адказныя за ландшафтны дызайн спецыялісты — да Галіны Аляксееўны далучаецца яшчэ і непасрэдны даглядчык аранжарэі, кветкавод Людміла Навуменка — запрашаюць больш дэталёва пазнаёміцца з дзівам.

— Прыбудова ўзводзілася з такім намерам, каб выдзеліць зону з аранжарэяй, — расказваюць суразмоўніцы. — І першай раслінай, па пажаданні Леаніда Майсеева, стаў менавіта бананавы саджанец.

Каб яго росту нічога не замінала, прыбудову запраектавалі так, каб з першага паверха і да самай столі быў скразны праём. Атрымалася, што зялёны астравок ёсць не толькі на першым паверсе, але і на другім. Другі наогул нагадвае аглядную пляцоўку, якая дае магчымасць палюбавацца прыгажосцю з усіх бакоў. Тут жа знаходзяцца працоўныя кабінеты. Пальмы цягнуць да іх свае лісты і, напэўна, пранiклі б і ўнутр, калі б іх крыху не падразалі. Пад столлю шмат святла, якое пранікае праз размешчаныя па перыметры вокны. Лісты ўпіраюцца ў шкло і, калі б не перашкода, даўно выскачылі б на вуліцу і накрылі сабой будынак.

Людміла Навуменка, якая працуе ў гаспадарцы з 1983 года, усміхаецца, што Леанід Майсееў вельмі клапаціўся пра экзатычную расліну і жартам казаў, што за яе галавой адказваюць. А работніца сапраўды перажывала. Спачатку расліна прыжывалася цяжка, даводзілася кансультавацца са спецыялістамі. Але потым замацавалася і з тых часоў не перастае радаваць. Саджанец за тры гады вымахаў да столі. І не толькі выцягнуўся, але яшчэ і даў шмат адросткаў. Так што цяпер тут ужо не адна, а некалькі дрэўцаў. Утварылася такая магутная каранёвая сістэма, што яны перыядычна з'яўляюцца то тут, то там. Хаця дрэвам бананавую расліну называць можна толькі ўмоўна. Паводле навуковаму гэта трава.

— Пад нашымі экзотамі нават падмурка няма, — бянтэжаць мяне суразмоўніцы. — Карані сыходзяць у адкрыты грунт. Але зімой яны не замярзаюць. Будынак ацяпляецца, і караням дастаткова камфортна. Тым больш што мы рэгулярна падкормліваем расліны, вясной азот уносім, восенню — фосфарна-калійныя ўгнаенні — яны ў нас ўсе мікраэлементы атрымліваюць. Грунт спецыяльны, дзе ўсё збалансавана.

Дрэвападобная трава зеляне ўсім работнікам на радасць, а наведвальнікаў часам прыводзіць у зман. Летась гаспадарку па справах наведала кіраўнік беларускага парламента Наталля Качанава. І спачатку нават не паверыла, што гэта жывыя расліны. Прыйшлося Галіне Макар расказваць гісторыю пра захапленне былога кіраўніка Леаніда Майсеева. На жаль, пладоў ён так і не дачакаўся, хоць і марыў.

Цуд адбыўся сёлета. У канцы чэрвеня супрацоўніцы звярнулі ўвагу на нейкі незвычайны «бутон» пад лістотай на адной з пальмаў. Ён быў падобны на кукурузны пачатак і хутка паявяліваўся ў памерах. Тым часам выстраліла і другая расліна, якая таксама выпусціла квітнеючую стралу. Праз некалькі тыдняў пачаткі на дрэвах разгарнуліся, усе ўбачылі гронкі маленькіх зялёных бананаў і адчулі невераґодна прыемны фруктовы пах. Работнікі па чарзе бегалі любавацца незвычайнай з'явай. Ахалі, рабілі сэлфі на фоне незвычайных пладоў, захапляліся салодкім водарам і ўслых абмяркоўвалі незвычайную з'яву. Цікава, і з чым гэта звязана?

— Напэўна, лета было спякотнае, і «пальмы» адчулі сябе ў сваёй стыхіі, — мяркуюць мае экскурсаводы. — Бананавая расліна наогул непрадказальная. А магчыма, яна так



аддзячыла за любоў і клопат, якімі тут яе акружылі. Мы іх вельмі любім, вось і яны пацягнуліся да нас з любоўю.

Магчыма, паўднёвыя жыхары адчулі глабальнае пацяпленне? Жыхары Афрыкі, Індыі цяпер вось беларускія прасторы асвойваюць. Пакуль, праўда, у аранжарэі.

— За бананавымі раслінамі вельмі цікава назіраць, — расказвае Галіна Макар. — Спачатку з'яўляецца такі зялёны слуп, а потым раскручваецца і пакрывае ўсё вакол сябе лісцем. Бачыце, пад столлю яны нават загнуліся. Вышыня іх 15 метраў, а дай ім волю, яны яшчэ на 10 метраў вымахаюць. Перыядычна прыходзіцца не толькі абразаць лісце, але і цалкам высякаць расліны. Вунь, бачыце пянькі засталіся. У іх нават ёсць кольцы, як у звычайных дрэў. Але ж расце хутка, як трава. Калі не рэгуляваць працэс, тут утварыўся б бананавы гай. Цяпер маем чатыры дарослыя расліны і шмат падлеткаў.

Першапачаткова ў зялёнай зоне быў зроблены яшчэ і акварыум з фантанам, але рыбкі там не прыжыліся. Тады яго засыпалі пяском і аддалі пад расліны. Некаторыя экзоты капрызнічаюць, ім не хапае святла і цяпла. Галіна Аляксееўна перасадзіла сюды інжыр, які ўжо пладаносіў, а ён загінуў. Нешта не спадабалася.

— У нас яшчэ і цяпліца ёсць, там для цеплалюбівых раслін больш камфортна і светла, — удакладняе спецыяліст. — У нас там і лімоны пладаносяць, і лаўр вымахаў высачэзны. Вырошчваем таксама расаду для азелянення. Усё, што бачыце каля нашага адміністрацыйнага будынка, а таксама на іншых аб'ектах — кароўніках, цялятніках, свінафермах, — выраcшана выключна нашымі рукамі. У нас вельмі шмат руж, гартэнзій. Нават з дрэвамі эксперыментуем. Раней на тэрыторыі агракамбіната раслі таполі, рабіны, дубы, клёны. Цяпер іх пацяснілі хвойнікі, істотна змяніўся ландшафт, стаў крыху паўднёвым.

— Але строіць планы па ўпрыгожванні тэрыторыі бананамі пакуль не спяшаемся, — смяюцца суразмоўніцы. — Добра, што яны ў нас у аранжарэі прыжыліся. Спадзяёмся, налета таксама будуць плады. Кажуць, што патрэбна пэўная каранёвая маса, каб яны выспявалі.

Тым не менш аранжарэя з бананавымі «пальмамі» — адна з візітак аграокамбіната.

— Хоць на «Дажынках» нашы дасягненні ў вырошчванні бананаў не адзначалі, адчуваем глыбокае задавальненне, — смяюцца жанчыны і дадаюць: — У нас тут аўра ведаеце чаму такая добрая? Гэта таму, што наша кіраўніца Кацярына Зароўская вельмі адказная, за ўсё турбуецца і перажывае. Расліны гэта таксама адчуваюць.

Добра было б пакаштаваць на смак беларускія бананы, але восень крыху запаволіла працэс выспявання. Наўскідку з кожнай гронкі пладоў па 60 будзе.

Аграном аграгаспадаркі Яўген Сялюгін усміхаецца, што бананы хоць і прыцягнулі ўвагу ўсіх да «Зары», стаўку гаспадарка робіць на традыцыйныя зерневыя і зернебабовыя культуры. Іх сёлета тут было сабрана 26 тысяч тон пры ўраджайнасці 46 цэнтнераў з гектара. «Усе першыя месяцы забралі на раённых «Дажынках», — задаволены аграном.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

*Магілёўскі раён.*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ЕС абяцаюць зрабіць больш жорсткім кантроль на граніцах і павялічыць рэпатрыяцыі



Лідары Бельгіі і Швецыі, а таксама выканаўчы дырэктар Еўрапейскага саюза абяцаюць зрабіць больш жорсткім кантроль на граніцах і ўзмацніць працэс рэпатрыяцыі пасля таго, як у Брусэлі былі застрэлены два шведскія футбольныя балельшчыкі. Пра гэта паведамляе Reuters. Гэтая стральба падкрэсліла складанасці, з якімі сутыкаецца ЕС пры кіраванні пытаннямі прытулку і міграцыі. Прэм'ер-міністр Швецыі Ульф Крыстэрсан заявіў, што Шэнгенская зона, якая забяспечвае свабоднае перамяшчэнне ў Еўропе, не зможа выжыць, калі знешнія граніцы ЕС не будуць лепш абаронены ад непажаданай міграцыі. Бельгійскі прэм'ер-міністр Аляксандр Дэ Кроа сказаў, што ЕС таксама мае патрэбу ў больш эфектыўнай сістэме вяртання нелегальных мігрантаў. Еўрапейская камісія сцвярджае, што новы міграцыйны пакт блока дапаможа прадухіліць надзвычайныя сітуацыі, забяспечыўшы больш хуткія дэпартацыі замежнікаў, якіх лічаць пагрозай для бяспекі.

### Падчас антываенных пратэстаў у Вашынгтоне арыштавалі 500 чалавек




Аб гэтым паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на заяву арганізацыі Jewish Voice for peace («Яўрэйскі голас за мір»). Паводле агенцтва арганізацыі, каб падтрымаць і «патрабаваць спынення агню і спынення генацыду палесцінцаў», на пратэсты на вуліцы выйшлі 10 тысяч чалавек, 500 яўрэяў былі арыштаваны. Пратэсты, удзельнікамі якіх сталі і члены арганізацыі Jewish Voice for peace, разгарнуліся каля комплексу будынкаў кангрэса. У адзін з іх прарваліся дзясяткі чалавек. Паліцыя Капітолія затрымала іх, маніфестантаў адціснулі з вуліц.

### На штучны інтэлект будзе выдаткавана звыш $140 млрд



Інвестыцыі кампаній у рашэнні на аснове генератыўнага штучнага інтэлекту, які стварае розны кантэнт, сёлета складуць 16 мільярдаў долараў, а ў 2027-м дасягнуць рэкордных $143 млрд. Гэта прагназуе даследчая арганізацыя International Data Corporation (IDC). Паводле даных IDC, штогадовы рост выдаткаў глабальных кампаній на развіццё і ўкараненне генератыўнага штучнага інтэлекту ў 2023—2027 гадах складзе звыш 70 працэнтаў. «Гэта больш чым у два разы перавышае тэмпы росту агульных выдаткаў на штучны інтэлект і амаль у 13 разоў перавышае сярэднегадавы тэмп росту сусветных выдаткаў на нейрасеткі за той жа перыяд», — адзначаюць эксперты даследчай кампаніі. «Генератыўны штучны інтэлект — гэта больш, чым мімалётная тэндэнцыя або проста шуміха. Гэта пераўтваральная тэхналогія з наступствамі, якія ідуць далёка, і вялікім уплывам на бізнес», — адзначыла віцэ-прэзідэнт IDC Рыту Джыёці.

# «ФАКТАР.BY» ЗНОЎ НА ЭКРАНАХ

**Сёння вечарам у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» стартуе трэці сезон любімага многімі талент-шоу «Фактар.BY». А значыць, на працягу некалькіх месяцаў на нашых вачах разгорнецца маштабнае вакальнае спаборніцтва, у якім самыя смелыя і таленавітыя выканаўцы з Беларусі і іншых краін паспрабуюць давесці настаўнікам і тэлеаўдыторыі, што менавіта яны вартыя звання пераможцы новага сезона праекта.**




«Фактар.BY» — гэта тое месца, дзе кожны мае магчымасць прадэманстраваць свае здольнасці і зрабіць рэальнасцю мары. І канкурсанты трэцяга сезона ўжо гатовыя скарарць сэрцы шматлікіх гледачоў сваімі непаўторнымі галасамі, артыстызмам і непадробный энергетыкай. Зусім хутка кожны з іх сустрэнецца на сцэне з зорнымі настаўнікам. Аднак на тое, каб гучна заявіць пра сябе, падзяліцца патаемнымі гісторыямі і пазмагацца за месца ў трэніровачным лагеры, у іх будзе толькі адна спроба.

Нагадаем, ацэньваць выступленні канкурсантаў у трэцім сезоне будуць хіп-хоп выканаўца і прадзюсар Сярога (Сяргей Пархоменка), тэлевядучая і спявачка Вольга Бузава, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Руслан Аляхно, а таксама музычны прадзюсар Іосіф Прыгожын. Таму не прапусціце прэм'еру новага сезона любімага шоу сёння ў 20.45 на «Беларусь 1».

А пры жаданні зазірнуць за кулісы і даведацца, як праходзілі здымкі тэлекастынгаў, можна ў відэадзённіках праекта. Таксама пра найбуйнейшую музычную падзею гэтай восені ў сваіх сюжэтах распавядаюць карэспандэнты Агенцтва тэлевізійных навін і праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!», карэспандэнты Беларускага радыё — Першага нацыянальнага канала, станцый «Радыус-FM» і «Сталіца», канала «Культура» і Міжнароднага радыё «Беларусь» на дзевяці мовах вяшчання. Сачыце, будзьце ў курсе падзей і падтрымлівайце сваіх новых фаварытаў.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 183

Сённяшняя задача *(гл. дыяграму)* належыць складальніку з Брэста Герасіму Вышынскаму (1917—1992). Герасім Кліматавіч — ураджэнец цяперашняга Кобрынскага раёна. Па прафесіі быў будаўніком. Апублікаваў больш за 60 задач, некаторыя з іх адзначаны ў конкурсах складання.



Калегі так адгукаліся пра творчасць Г. Вышынскага: «Шырокі дыяпазон (двух- і трохходоўкі, задачы на кааператыўны і зваротны мат) прыцягвае ўвагу многіх шахматных спецыялістаў і перыядычных выданняў, дзе друкуюцца і каментуюцца творы ветэрана».

Дарэчы, прапанаваная задача ўпершыню ўбачыла свет ў бюлетэні «Шахматы, шашкі в БССР» — цікавым выданні, што выходзіла ў нашай рэспубліцы ў савецкія часы.

**Белыя:** Крb3, Лс7, Cf8, Cg4, Кс6, Ке5, пп. с2, е2, f3 (9).

**Чорныя:** Крd5, Са5, Сс8, Kb2, Kf2, пd2 (6).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Прапануем увазе чытачоў некалькі партый з сёлетняга першынства Беларусі сярод шахматыстаў да 20 гадоў.

Максім Царук — Антон Цімашэнка. 1. е4 е6 2. d4 d5 3. Кс3 de 4. К:е4 Kd7 5. g3 Kgf6 6. К:f6+ К:f6 7. Cg2 е5 8. Фе2 Ф:d4 9. Kf3 Cb4+ 10. с3 С:с3+ 11. Крf1 Фс5 12. Се3 Фа5 13. bc 0-0 14. Крg1 Ле8 15. h3 с6 16. с4 Cf5 17. Крh2 Лad8 18. Лhd1 h6 19. Л:d8 Л:d8 20. Лd1 Ле8 21. Фd2 Фа4 22. Лс1 Kd7 23. Фb2 Фа6 24. Лс3 Kb6 25. Ла3 Ф:с4 26. Л:а7 Kd7 27. Ф:b7 Лb8 28. Ла8 Л:а8 29. Ф:а8+ Крh7 30. Kd2 Фс2 31. g4 Cg6 32. Ф:с6, 1:0.

Ніка Венская — Вераніка Абрамкіна. 1. d4 Kf6 2. с4 с5 3. е3 g6 4. Kf3 Cg7 5. Кс3 0-0 6. Се2 cd 7. ed d5 8. 0-0 Кс6 9. Се3 dc 10. С:с4 Kg4 11. Фd2 К:е3 12. fe Ка5 13. Се2 Cg4 14. Лad1 Лс8 15. b3 С:f3 16. С:f3 е5 17. d5 Ch6 18. d6 Кс6 19. d7 Лb8 20. Фе2 Фg5 21. Лfe1 f5 22. Фс4+ Крh8 23. С:с6 bc 24. Ф:с6 е4 25. Kd5 Фg4 26. Фс3+ Cg7 27. Фс7 Ch6 28. Kf6 С:е3+ 29. Крh1 Фf4 30. d8Ф Лb:d8 31. Ф:h7x

Ксенія Зелянцова — Ніка Венская. 1. е4 d6 2. d4 Kf6 3. Кс3 g6 4. Kf3 Cg7 5. Се2 0-0 6. Cg5 с6 7. 0-0 Фс7 8. Фd2 Kbd7 9. а4 е5 10. Лfe1 Ле8 11. Сс4 Kb6 12. Cb3 Cg4 13. С:f6 С:f6 14. Kg5 С:g5 15. Ф:g5 ed 16. Ф:g4 dc 17. bc d5 18. h4 Фе5 19. а5 Кс4 20. С:с4 dc 21. Ле3 h5 22. Фе2 b5 23. ab6 ab 24. Лf1 Фс5 25. е5 Ле6 26. f4 f6 27. Крh2 Лае8 28. Лg3 fe 29. Ф:h5 Фd6 30. f5 е4 31. fg Л8е7 32. Лf8+ Кр:f8 33. Фh8x

* * *

У першынстве Брэсцкай вобласці прызавую тройку склалі Дзяніс Бруцкі, Аляксей Грыгаровіч і Антон Цімашэнка, Магілёўскай вобласці — міжнародны майстар Пётр Карзубаў, Сяргей Вашчылаў і Аляксандр Галубкоў. Чэмпіёнкамі абласцей сталі адпаведна Мілена Сідарэня і Маргарыта Бендзік.

На турніры ў Ерэване (134 удзельнікі) Аляксей Аляксандраў фінішаваў на 27-м месцы, Вячаслаў Зарубіцкі — на 28-м. Яшчэ адзін турнір адбыўся ў армянскім горадзе Цахкадзор (120 гульцоў) — у «класічных шахматах» Максім Царук і В. Зарубіцкі набралі па 6 балаў з 9, а ў бліцы М. Царук заняў шостае месца, паказаўшы найлепшы вынік сярод шахматыстаў да 18 гадоў.

У турніры па бліцы на сайце chess.com (577 удзельнікаў) Дзяніс Лазавік заняў 6-е месца, Сяргей Жыгалка — 24-е.

* * *

Задачы з мінулага выпуску рашаюцца: М. Кошаля — 1. Ch5! (1. Фе7? Крg6!; 1. Ла7? Крf6!; 1. Ле2? Крg6!); С. Дарошчанкі — 1.Фb2! Правільна адказалі Васіль Жуковіч, Барыс Маркін, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**



# ШТО ПАЧЫТАЦЬ У ЧАСОПІСЕ «АЛЕСЯ» Ў КАСТРЫЧНІКУ




## СЭРЦА, АДДАДЗЕНАЕ ДЗЕЦЯМ

Гаспадыня мегавялікай сям'і, клапатлівая мама ўсім выхаванцам, дырэктар ДУА «Мазырскі дзіцячы дом» Ірына Вішнеўская распавядае аб прынцыпах і ўмовах выхавання дзяцей, што засталіся без догляду бацькоў.

— Мы не цураемся ніякіх дзяцей. Многія з іх у мінулым былі заложнікамі няпростых жыццёвых сітуацый і маюць адмоўны сацыяльны вопыт. Мы імкнёмся іх, у першую чаргу, маральна аздаравіць. Вучым з разуменнем ставіцца да памылак бацькоў, дараваць ім і давяраць людзям, — адзначае Ірына Вішнеўская.





За 20 гадоў Ірына Іванаўна шмат чаго зрабіла для дзіцячай установы, якую ўзначальвае. Цяпер у хлопчыкаў і дзяўчынак ёсць усё для цікавага, насычанага жыцця, вучобы і адпачынку. А дырэктар ставіць перад сабой новыя мэты. Самая лепшая падзяка для яе — шчаслівая ўсмешка кожнага выхаванца. Ірына Вішнеўская перамагла ў рэспубліканскім конкурсе «Жанчына года — 2022» у намінацыі «Сэрца аддаю людзям».

## РАСШЫФРАВАЦЬ ТАЯМНІЧЫЯ «ПЕЙЗАЖЫ ДУШЫ»

